**Тэма 9.2 Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні ў неславянскіх краінах Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы пасля дэмакратычных рэвалюцый.**

1. Трансфармацыя мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця.
2. Унутрыпалітычнае развіццё.
3. Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі.

**Літаратура**

Очерки политической истории стран Центральной и Юго-Восточной Европы. Конец XX – начало XXI века : [коллективная монография] / Ин-т славяноведения РАН. – Санкт-Петербург: Нестор-История, 2020. – 462 с.

Лазько, Г. Г. Авторитарно-бюрократический социализм в европейских странах: становление и крах : пособие для учителей / Г. Г. Лазько. –Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 1992. – 37 с.

Новейшая история стран Европы и Америки. XX век. В 3. ч. / Под ред. А. М. Родригеса и М.В.Пономарева. – М.: Гуманитар. Изд. Центр «Владос», 2001. – Ч. 3. – 336 с.

История новейшего времени стран Европы и Америки. 1945–2000 гг. / Под ред. Л. С. Белоусова, Е. Ф. Язькова и др. – М.: Простор, 2003. – 480 с.

Патрушев, А. И. Германия в XX веке: учебное пособие / А. И. Патрушев. – М.: Дрофа, 2004. – 432 с.

История Германии : учебное пособие : в 3 тт. / Под общ.ред. Б. Бонвеча, Ю. В. Галактионова. – М.: КДУ, 2008. – Т. 2. – 672 с.

Смирнова Н. Д. История Албании в XX веке / Н.Д. Смирнова; Ин-т всеобщей истории / Н. Д. Смирнова. – М.: Наука, 2003. – 431 с.

Контлер, Ласло. История Венгрии. Тысячелетие в центре Европы / Пер. с англ. / Ласло Контлер – М: Издательство «Весь Мир», 2002. – 656 с.

История Румынии / И. Болован, И.-А. Поп (координаторы) и др. / Пер. с рум. – М.: Издательство «Весь мир», 2005. – 680 с.

Польша, Литва, Латвия, Эстония: социально-экономическое и политическое развитие : монография. Под ред. А. М. Клемешева. – М.: ИНФРА–М, 2019. – 134 с.

**1.** У эканоміцы новыя палітычныя сілы, якія прышлі да ўлады, бачылі задачу ў ліквідацыі камандна-адміністрацыйнай сістэмы і пераходзе да рыначнай эканомікі. Асноўнымі элементамі пераходу да рыначнай эканомікі сталі ўвядзенне свабодных цэн, прыватызацыя, свабода прадпрымальніцкай дзейнасці, адмена манаполіі знешняга гандлю, свабодная канвертацыя нацыянальных валют. За дзяржавай захоўваліся толькі ўскосныя метады рэгулявання. Аднак тэмпы і формы гэтага пераходу ў розных постсацыялістычных краінах былі рознымі. Выдзяляюць два асноўныя варыянты трансфармацыі эканомікі былых сацыялістычных краін: “шокавая тэрапія” (рэзкі, скачкападобны пераход да рыначных адносін) і варыянт плаўных пераўтварэнняў. У рамках “шокавай тэрапіі” на першы план

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выходзіла дасягненне фінансавай стабілізацыі за кошт рэзкага скарачэння дзяржаўных выдаткаў. Мелася на ўвазе максімальна хуткая лібералізацыя эканомікі.

Больш спрыяльныя ўмовы для пераходу да рынку склаліся ў тых краінах, дзе яшчэ ў рамках сацыялістычнай мадэлі праводзіліся рэформы, якія ўводзілі элементы рыначных адносін, дзе існаваў дробнатаварны прыватны сектар. Прыкладам такой постсацыялістычнай краіны з'яўляецца Венгрыя. Тут рэформы часоў Я. Кадара ў некаторай ступені падрыхтавалі пераход да рыначнай эканомікі. Галоўным напрамкам эканамічных пераўтварэнняў на пачатковым этапе стала ў Венгрыі прыватызацыя. Да 1994 г. у руках дзяржавы засталося 50 % прамысловых прадпрыемстваў. Прыватызацыя суправаджалася рэструктурызацыяй буйных прадпрыемстваў. Яны раздрабляліся на невялікія прыватныя і акцыянерныя кампаніі. Лідарам у справе прыватызацыі выступала сфера паслуг.

Ужо ў першыя постсацыялістычныя гады Венгрыя была ацэнена заходнімі фінансавымі інстытутамі як краіна, прывабная для інвестыцый. Гэта стымулявала прыток замежных інвестыцый. У 1990–1998 гг. у венгерскую эканоміку замежныя інвестары ўклалі 19 млрд. дол. Кожнае чацвёртае прадпрыемства стала сумесным. Замежныя інвестыцыі садзейнічалі тэхналагічнай мадэрнізацыі вытворчасці.

У Румыніі і Албаніі эканоміка была не падрыхтавана да рыначных рэформ. Румынскія ўлады ў умовах беднасці асноўнай масы насельніцтва вымушаны былі лавіраваць паміж неабходнасцю дасягнення фінансавай стабілізацыі праз лібералізацыю цэн і жорсткую эканомію і імкненнем захаваць сацыяльную падтрымку з боку дзяржавы для шырокіх колаў насельніцтва. Такая ж сітуацыя склалася ў Албаніі. У Румыніі разгарнулася барацьба паміж прэзідэнтам Іліеску, які быў прыхільнікам плаўнага ўваходжання ў рынак і прэм'ер-міністрам Романам, які выступаў за варыянт “шокавай тэрапіі”. У студзені 1991 г. была прынята праграма Романа, якая прадугледжвала прыватызацыю, лібералізацыю цэн. У Румыніі была прыменена ваучарная сістэма прыватызацыі, якая аказалася неэфектыўнай. Многія буйныя прадпрыемствы перажылі ў выніку прыватызацыі банкруцтва і спыненне вытворчасці. З-за масавых пратэстаў і ў сувязі з прыходам да ўлады ў 1992 г. левых сіл рэформы былі затарможаны. У выніку эканамічнае становішча пагаршалася і ў 1996 г. падзенне рэальных даходаў насельніцтва склала 70 % у параўнанні з канцом 1980-х гг. З-за незадавальняючага правядзення рэформ МВФ адмовіў Румыніі ў крэдытах. З прыходам да ўлады ў 1996 г. правых сіл была зроблена спроба актывізаваць пераход да рынку. Стаўка рабілася на прыватызацыю, закрыццё стратных прадпрыемстваў, дасягненне фінансавай стабілізацыі. Аднак гэтыя крокі былі неадназначна ўспрыняты не толькі насельніцтвам, але і ўнутры правячай кааліцыі. Паслядоўнага сістэмнага рэфармавання эканомікі зноў не атрымалася. У выніку ў 1998–1999 г. ВУП зніжаўся на 4–6 %, інфляцыя склала 58 %, 1/3 насельніцтва жыла за рысай беднасці.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У вельмі цяжкім становішчы аказаліся краіны Балтыі. Спыненне паставак сыравіны з СССР і закрыццё для Літвы, Латвіі, Эстоніі былога савецкага рынку прывяло да таго, што большасць прамысловых прадпрыемстваў сталі нікому не патрэбныя, развітае станкабудаванне іншыя галіны цяжкай прамысловасці пазбавіліся заказаў.

Нягледзячы на розныя варыянты пераходу да рынку, ён выклікаў значныя эканамічныя праблемы. У першыя гады рэформ адбываўся спад вытворчасці. Але ў Венгрыі ён склаў 20 %, а ў Румыніі і Албаніі – 50 %. У Літве ВУП на душу насельніцтву ў 1993 г. склаў толькі 40 % ад узроўню 1988 г. Рэзка вырасла беспрацоўе: у Румыніі да 11 %, у Венгрыі – да 12 %. У Албаніі беспрацоўным быў кожны трэці. Тэмпы інфляцыі складалі 20–40 % у год. Значна зменшылася фінансаванне адукацыі, навукі, сістэмы аховы здароўя. Адбылося падзенне рэальных даходаў насельніцтва. Рэзка ўзрасло маёмаснае расслаенне насельніцтва. Для значнай часткі насельніцтва аказалася вялікай праблемай прыстасавацца да жыцця і працы ва ўмовах рынку.

Нягледзячы на названыя праблемы, у Венгрыі ў сярэдзіне 1990-х гг. быў працягнуты манетарысцкі курс, нават калі ў 1994 г. да ўлады прыйшлі сацыялісты. Была праведзена дэвальвацыя форынта, зменшаны бюджэтныя выдаткі, зарплаты ў бюджэтнай сферы. Працягвалася прыватызацыя. У канцы 1990-х гг. у Венгрыі на прыватны сектар прыходзілася больш за 70 % вытворчасці. Прыватызаваліся буйныя прадпрыемствы ў базавых галінах, часта праз аўкцыёны. З сярэдзіны 1990-х гг. Венгрыя пачала выходзіць з крызісу, абазначыўся эканамічны рост. Скарацілася знешняя запазычанасць, беспрацоўе. Рост эканомікі дазволіў пашырыць сацыяльную палітыку. Па долі сацыяльных расходаў у ВУП Венгрыя ў канцы 1990-х гг. выйшла на ўзровень скандынаўскіх краін. У канцы 1990-х гадоў Венгрыя практычна дасягнула дакрызіснага ўзроўню вытворчасці. У 2000–2005 гг. ВУП Венгрыі вырас на 30 %. А ў Румыніі ў 1999 г. узровень прамысловай вытворчасці склаў толькі 40,8 %. У Румыніі эканамічны рост пачаўся толькі з пачатку 2000-х гг. У 2001 г. ён склаў 5,7 %, а ў 2004 г. – 8,3 %.

У Албаніі дзякуючы не столькі рэформам, колькі значнай знешняй дапамозе рост эканомікі пачаўся ўжо ў 1993 г. – 9,6 %, а ў 1995 г. дасягнуў 14 %. Інфляцыя знізілася да 6 % у год. Але пры гэтым многія буйныя прадпрыемствы, прыватызацыя якіх адбылася па карупцыйных схемах, так і не пачалі працаваць. Высокім заставалася беспрацоўе.

У сярэдзіне 1990-х гг. эканамічны рост пачаўся і ў краінах Эстоніі, Латвіі і Літве, якія ішлі па шляху радыкальных рыначных рэформ. Фінасавы крызіс у Расіі ў 1998–1999 гг. падштурхнуў краіны Балтыі да пераарыентацыі з рынкаў СНД на рынкі Заходняй Еўропы. Так, для Літвы асноўным рынкам сталі Германія і Польшча. Гэтая пераарыентацыя канчаткова замацавалася ў сувязі з уступленнем краін Балтыі ў ЕС у 2004 г.

На сацыяльна-эканамічную палітыку краін ЦПУЕ моцны ўплыў аказвала іх імкненне да еўрапейскай інтэграцыі. Яны павінны былі прыводзіць свае эканамічныя мадэлі ў адпаведнасць з стандартамі ЕС. На нацыянальную

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

глебу пераносіліся нормы і правілы ЕС. У Венгрыі ўжо з 1990 г. ні адзін закон не прымаўся без папярэдняй экспертызы ЕС на адпаведнасць патрабаванням заканадаўству саюза.

Ва ўмовах фінансавага крызісу 2008 г. Венгрыя і Румынія аказаліся ў ліку краін, якія перажылі асабліва значнае падзенне ВУП. Адпаведна, 7,2 % і 7,5 %. (Для параўнання, Чэхія – 4,3 %, а Польшча захавала рост эканомікі). Крызіс выклікаў рост дэфіцыту бюджэту, дзяржаўнага доўга. У Румыніі рэзка вырасла знешняя запазычанасць і міжнародныя фінансавыя структуры адмовілі ёй у новых крэдытах для пераадолення крызісу. З такой жа сітуацыяй сутыкнулася і Венгрыя (знешні доўг 100 млрд. дол.). Беспрацоўе ў Венгрыі склала 10,5 %, у Румыніі – 7,8 %. Выхад з крызісу названых краін быў павольным. Тым не менш па рэйтынгу якасці жыцця Венгрыя ў 2009 г. заняла 20 месца ў свеце. Асноўным інструментам пераадолення крызісу Венгрыяй стала палітыка фінансвай стабілізацыі праз павышэнне падаткаў. З 2013 г. у эканоміцы Венгрыі абазначыўся эканамічны рост. Гаворачы аб дасягненнях Венгрыі ў сацыяльна-эканамічнай сферы, неабходна адзначыць і праблемы. Вянгерскі эканаміст Эржбет Салаі лічыць, што для Венгрыі, як і для большасці постсацыялістычных краін адна з асноўных праблем – гэта сацыяльная няроўнасць. Гэтая няроўнасць набыла спадчыны характар. Назіраецца нізкі ўзровень сацыяльнай мабільнасці.

У Румыніі ўрад Бока таксама праводзіў палітыку жорсткай эканоміі. Так, у 2010 г. на 25 % была зніжана зарплата бюджэтнікаў. Пасля ўступлення ў ЕС Румынія адносна паспяхова пачала ўстройваць сваю эканаміку ў заходнееўрапейскую, спецыялізуючыся на машынабудаванні.

Іншая сітуацыя склалася ў Албаніі. Правацэнтрысцкі ўрад Салі Берышы змог з 2006 па 2011 г. забяспечыць сярэдні прырост эканомікі ў 3,5 %. Вельмі важнае значэнне для эканомікі Албаніі мелі грашовыя пераводы тых, хто працаваў за мяжой. Албанія змагла значна скараціць адставанне ад іншых краін Еўропы па ВУП на душу насельніцтва, хоць і засталася на адным з апошніх месц. У пачатку 2010-х гг. пад уплывам крызісных з’яў у ЕС запаволіліся тэмпы эканамічнага развіцця Албаніі. Адным з найбольш важных фактараў, якія перашкаджаюць развіццю албанскай эканомікі, з’яўляецца карупцыя. Албанія ператварылася ў буйнога пастаўшчыка наркотыкаў на міжнародныя рынкі. Яна адрозніваецца ад іншых постсацыялістычных краін найбольш значнай роллю сельскай гаспадаркі ў эканоміцы.

**2.** Ужо на працягу 1990–1992 гг. у былых сацыялістычных краінах адбылася карэнная перабудова дзяржаўна-палітычнай сітэмы. Новы дзяржаўны лад грунтаваўся на палітычным плюралізме, галоснасці, шматпартыйнасці, падзеле ўлад, прыярытэце праў чалавека. Асаблівасць Літвы, Латвіі і Эстоніі заключалася ў тым, што тут важнейшым кампанентам рэвалюцыі з’яўлялася аднаўленне незалежнасці краіны. Да ўлады прыйшлі народныя франты, якія стаялі на нацыяналістычных пазіцыях.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Сацыяльная цана рэформ пачатку 1990-х гг. аказалася больш высокай, чым чакала грамадства. Гэта вяло да разчаравання ў тых палітычных сілах, якія ажыццяўлялі рыначныя рэформы. Пры гэтым ставілася пад сумненне не неабходнасць пераходу да рынку, а дыскутавалася пытанне аб метадах гэтага пераходу. Сімпатыі грамадзян сталі змяшчацца ў бок левых партый, якія выступалі з ідэяй сацыяльнай рыначнай эканомікі, крытыкавалі метады “шокавай тэрапіі”.

У Венгрыі дадзены паварот улева адбыўся ў час выбараў у парламент 1994 г. Большасць выбаршчыкаў прагаласавалі за Венгерскую сацыялістычную партыю (ВСП) – былых камуністаў. Паражэнне Венгерскага дэмакратычнага форуму (ВДФ) было вынікам не толькі наяўнасці эканамічных праблем у ўмовах пераходу да рынку. Незадавальненне грамадства выклікалі такія аспекты палітыкі ВДФ як нацыяналізм, спробы рэабілітацыі харцізму, імкненне да кантролю над сродкамі масавай інфармацыі. Аднак сацыялісты не рашыліся фарміраваць аднапартыйны ўрад і прыцягнулі ў кааліцыю ліберальны Саюз свабодных дэмакратаў (ССД). Урад узначаліў сацыяліст Дьюла Хорн. Ён працягнуў жорсткі манетарысцкі курс ВДФ, забяспечыў рост эканомікі. Але да парламенцкіх выбараў 1998 г. венгры не паспелі ў поўнай меры адчуць уздзеянне эканамічнага росту на свой жыццёвы ўзровень. Гэта прывяло да паражэння ВСП на гэтых выбарах. Да ўлады вярнуліся правыя сілы на чале з партыяй Альянс (Саюз) маладых дэмакратаў – Венгерская грамадзянская партыя (ФІДЕС – ВГП), лідар Віктор Орбан, у кааліцыі з ВДФ.

У Румыніі сацыяльна-палітычная сітуацыя прынцыпова адрознівалася ад Венгрыі. Тут пераход да капіталізму суправаджаўся крызісам не толькі ў эканоміцы, але і ў палітычнай сферы. Рэзкае незадавальненне эканамічнай трасфармацыяй, якая суправаджалася сур’ёзнымі сацыяльным выдаткамі, выказвалі румынскія шахцёры. У 1990 г. яны ажыццявілі паход на Бухарэст і дапамаглі ўраду на чале з былымі камуністамі падавіць студэнцкія выступленні. У 1991 г. шахцёры ўстроілі ў сталіцы масавыя беспарадкі і пагромы ўжо пратэстуючы супраць палітыкі рэфармісцкага ўрада Петрэ Романа. Вынікам выступленняў шахцёраў стала фарміраванне ўрада левацэнтрысцкай кааліцыі. Гэтыя падзеі прывялі да расколу Фронта нацынальнага выратавання. У ім засталася правая частка, абноўлены ФНВ узначаліў Роман. Левая частка стварыла Дэмакратычны фронт нацыянальнага выратавання (які затым быў пераўтвораны ў Партыю нацыяльнай дэмакратыі Румыніі) на чале з Іліеску.

Восенню 1992 г. у Румыніі адбыліся датэрміновыя парламенцкія і прэзідэнцкія выбары. Прэзідэнтам быў зноў абраны Іліеску. На парламенцкіх выбарах перавага была на баку левых партый. Такім чынам, у адрозненні ад шэрагу іншых постсацыялістычных краін, у Румыніі ў 1990–1996 гг. дамінавалі левыя і левацэнтрысцкія палітычныя сілы. Улады паспрабавалі актывізаваць рыначныя рэформы. Дзяржаўныя прадпрыемствы пачалі пераўтвараць у акцыянерныя таварыствы. Але працэс ішоў павольна і не

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

суправаджаўся рэструктурызацыяй. Канфіскаваныя пасля 1945 г. зямля (не больш 10 га), жыллё сталі вяртаць былым уласнікам.

Вынікам расчаравання выбаршчыкаў у палітыцы сацыялістаў стала перамога на парламенцкіх і прэзідэнскіх выбарах 1996 г. правых палітычных сіл, якія былі аб’яднаны ў Румынскую дэмакратычную канвенцыю і Сацыял-дэмакратычны саюз. Новым прэзідэнтам быў абраны Эміл Канстанцінеску. Менавіта выбары 1996 г. прывялі да замены ў Румыніі ва ўладзе посткамуністычнай эліты на прадстаўнікоў новай палітычнай эліты. Адбылася рэальная альтэрнатыўная змена ўлады. Сітуацыя ў Румыніі адрознівалася ад многіх іншых постсацыялістычных краін. У іх адбываўся паварот ўлева ў палітычным жыцці, а ў Румыніі – управа.

Новы ўрад вярнуўся да расследавання падзей у Бухарэсце 1991 г. У выніку лідар шахцёраў М. Косма апынуўся ў турме. Гэта стала нагодай для новых шахцёрскіх выступленняў. У студзені 1999 г. шахцёры арганізавалі новы паход на Бухарэст. Спачатку ўрад пайшоў на саступкі і пагадзіўся на павышэнне заработнай платы шахцёрам, захаванне нерэнтабельных шахт. Але затым шахцёрскі рух быў разгромлены. Унутры правячай правай кааліцыі пастаянна ішла ўнутраная барацьба, канфліктнымі былі адносіны ўрада з прэзідэнтам. Гэта перашкаджала ажыццяўленню эфектыўнай палітыкі, накіраванай на аздараўленне эканомікі.

Падобна Румыніі ў Літве ў сярэдзіне 1990-х гг. адбыўся павορт у палітычным жыцці на карысць правых палітычных сіл. З моманту заваявання незалежнасці перавагу ў палітычным жыцці мела Дэмакратычная партыя працы Літвы (былыя камуністы). Лідар ДППЛ Альгірдас Бразаўскас у 1993 г. быў абраны прэзідэнтам. Паварот управа адбыўся ў 1996 г., калі перамогу на парламенцкіх выбарах атрымала партыя Саюз Айчынны – Правыя кансерватары. У 1998 г. Бразаўскаса на пасадзе прэзідэнта змяніў кандыдат ад правых палітычных сіл Валдас Адамкус. Але ў Літве правы паварот аказаўся непрацяглым. У 2001 г. да ўлады вярнуліся левацэнтрысцкія сілы на чале з Бразаўскасам, які заняў пасаду прэм’ер-міністра.

У эканамічна адсталай Албаніі эканамічная трансфармацыя праходзіла асабліва балюча і суправаджалася палітычнымі патрасеннямі. Пасля парламенцкіх выбараў 1992 г. правячай з’яўлялася Дэмакратычная партыя. Яе ўрад узначальваў Салі Берыша. Рэформы яго ўрада не прывялі да хуткіх пазітыўных змен. Сацыяльна-эканамічная мадэль, якая ўтварылася ў Албаніі ў першыя постсацыялістычныя гады, можа быць ахарактарызавана як дзяржаўна-крымінальны капіталізм. Органы ўлады раз’ядала карупцыя.

Масавае незадавальненне было накіравана супраць урада Дэмакратычнай партыі прэзідэнта Берышы. У канцы 1996 г. рухнулі некалькі фінансавых пірамід. Пацярпела каля 2/3 албанскіх сем’яў на суму каля 2 млрд. дол. Гэтыя падзеі далі штуршок узброеным выступленням насельніцтва. Пачаліся сутыкненні з паліцыяй. Адбыўся масавы ад’езд у Італію. Прэзідэнт Берыша пайшоў у адстаўку. Цэнтральная ўлада практычна перастала існаваць. У краіну ў адпаведнасцім з рэзалюцыяй Савета Бяспекі ААН былі ўведзены шматнацыянальныя сілы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

29 чэрвеня 1997 адбыліся парламенцкія выбары, на якіх перамогу атрымала Сацыялістычная партыя Албаніі. Але вострае палітычнае супрацьстаянне ў краіне захавалася. У верасні 1998 г. быў забіты адзін з лідараў дэмакратычнай апазіцыі. У адказ прыхільнікі апазіцыі захапілі ў Цiране шэраг адміністрацыйных будынкаў, радыё, тэлебачанне. З вялікімі цяжкасцямі канфлікт удалося з дапамогай міжнароднага ўмяшання ўрэгуляваць мірнымі сродкамі, а Берыша захаваў пасаду прэм’ер-міністра. У лістападзе 1998 г. была прынята на рэферэндуме новая канстытуцыя Албаніі. Яна абвясціла Албанію парламенцкай рэспублікай. Як раз у гэты час абвастрыўся косаўскі крызіс. Салі Берыша выкарыстаў крызісную сітуацыю для вяртання да актыўнага палітычнага жыцця.

Нягледзячы на ўсе праблемы, з якімі сутыкнуліся Румынія і Албанія, усё ж і ў іх да канца 1990-х гг. адбыўся пераход да сістэмы заходняй парламенцкай дэмакратыі. Аднак яна сутыкалася са значнымі праблемамі ў сваім функцыянаванні.

Пачатак 2000-х гг. прынёс змены ў ррасстаноўцы партыйна-палітычных сіл у былых сацыялістычных краінах. У Румыніі ў 2001 г. у выніку аб’яднання Румынскай сацыял-дэмакратычнай партыі (РСДП) з і Партыі сацыяльнай дэмакратыі утварылася моцная левацэнтрысцкая Сацыял-дэмакратычная партыя Румыніі (СДП). Сярод правацэнтрысцкіх палітычных сіл у якасці вядучай вызначылася Нацыянальная ліберальная партыя. Пачатак 2000-х гг. знаменаваўся для Румыніі чаргаваннем ва ўладзе правых і левых урадаў. На парламенцкіх выбарах 2000 г. перамагла левая кааліцыя на чале з СДП. Яе кандыдат І. Іліеску зноў быў абраны прэзідэнтам краіны. Але прэзідэнцкія выбары прадэманстравалі рост уплыву крайне правых нацыяналістычных сіл у Румыніі. У другі тур разам з Іліеску выйшаў лідар партыі Вялікая Румынія Вадзім Тудор. Поспех правых радыкалаў тлумачыцца расчараваннем румын у палітыцы рэформ, якая на той момант прывяла толькі да пагаршэння эканамічнага становішча і падзення ўзроўню жыцця. Сфарміраваны пасля выбараў 2000 г. урад на чале з сацыял-дэмакратам Арыянам Нэстасе (да 2004 г.) стаў першым урадам, якому ўдалося дабіцца эканамічнага росту ў Румыніі. Гэта садзейнічала стабілізацыі і палітычнай сітуацыі.

На парламенцкіх выбарах 2004 г. перамога дасталася ўжо праваму блоку “Справядлівасць і Праўда”, аснову якога складалі Дэмакратычная ліберальная і Нацыянальная ліберальная партыі. Кандыдат правых Траян Бэсеску быў абраны прэзідэнтам. Па выніках парламенцкіх выбараў 2008 г. у Румыніі склалася кааліцыя вядучай левацэнтрысцкай СДП і правацэнтрысцкай Дэмакратычнай ліберальнай партыі. Урад узначаліў прадстаўнік апошняй Эміль Боку. У сілу сваёй супярэчлівасці названая кааліцыя праіснавала толькі год. Паля чаго Боку стаў кіраўніком урада парламенцкай меншасці пры падтрымцы прэзідэнта. Выбары 2012 г. прынеслі перамогу альянсу СДП і Нацыянальна-ліберальнай партыі. Але і гэтая кааліцыя праіснавала толькі да 2014 г. Сацыял-дэмакраты, мяняючы партнёраў па кааліцыі, захоўвалі выдучыя пазіцыі у кіраванні краінай да

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

канца 2019 г., калі пасада прэм’ер-міністра перайшла да Нацыянальна-ліберальнай партыі. Палітычная сітуацыя ў Румыніі вызначаецца высокай ступенню нестабільнасці. З часу парламенцкіх выбараў 2008 г. да выбараў 2020 г. змянілася 19 урадаў. Яны мелі кааліцыйны храктар, шэраг з іх не абапіраліся на парламенцкую большасць.

У Венгрыі сфарміраваліся правацэтрысцкі і левацэнтрысцкі палітычныя палюсы. На правым фланзе найбольш значнай сілай выступае Альянс (Саюз) маладых дэмакратаў – Венгерская грамадзянская партыя (затым –саюз). На левым фланзе – Венгерская сацыялістычная партыя. Да 2010 г. пераважаў уплыў сацыялістаў. Яны пасля парламенцкіх выбараў 2002 г. захавалі кааліцыю з Саюзам свабодных дэмакратаў (ССД). Але ўплыў гэтай партыі змяншаўся, як і Венгерскага дэмакратычнага форума. Сацыяльна-эканамічная палітыка ўрада на чале з лідарам сацыялістаў Ферэнцам Дзюрчаням не вызначалася высокай эфектыўнасцю. У краіне значна выраслі падаткі, дэфіцыт бюджэта. Насельніцтва негатыўна ўспрыняло рэформы аховы здароўя і адукацыі, якія мелі на ўвазе пашырэнне платнай медыцыны і вышэйшай адукацыі. У сувязі з разыходжаннямі па пытаннях сацыяльна-эканамічнай палітыкі ў 2008 г. распалася кааліцыя сацыялістаў з ССД, якая праіснавала 12 гадоў. У час выбараў 2014 г. СПВ стварыла кааліцыю з некалькімі дробнымі левымі партыямі і рухамі, але яна пацярпела цяжкае паражэнне.

На час кабінета Ф. Дзюрчаня прыйшоўся эканамічны крызіс 2008 г., які для Венгрыі быў дастаткова цяжкім. Гэта выклікала значныя пратэсты. 2009 г. стаў для Венгрыі рэкордным па колькасці забастовак. З 2010 г. у якасці правячай замацаваўся Альянс маладых дэмакратаў (ФІДЕС) – Венгерскі грамадзянскі саюз, які выступае ў кааліцыі з Хрысціянска-дэмакратычнай народнай партыяй. Яго лідар Віктар Орбан узначальвае ўрад па сённяшні дзень. На крайне правым фланзе ў якасці кансерватыўнай нацыяналістычнай партыі замацаваўся Рух за лепшую Венгрыю (Йобік – Лепшы). У час выбараў 2014 г. ВСП ставарыла кааліцыю “Згуртаванне” з некалькімі дробнымі левымі партыямі і рухамі, але яна пацярпела цяжкае пражэнне: толькі 19, 1 % галасоў і 38 месцаў у парламенце з 199. А на выбарах 2018 г. сацыялісты сталі толькі трэцімі, саступіўшы другое месца Йобік. Такім чынам, у Венгрыі ў 2010-х гг. у палітычным жыцці ўсталявалася яўнае дамінаванне правых палітычных сіл.

У 2011 г. прынята новая канстытуцыя Венгрыі. Яе прыняцце суправаджалася акцыямі пратэсту. Іх выклікалі палажэнні канстытуцыі, якія пярэчаць неаліберальным уяўленням аб правах чалавека. Так, у канстытуцыі прапісана, што дзяржава павінна абараняць жыццё грамадзян, а жыцця пачынаецца з моманту зачацця. Шлюб, згодна канстытуцыі, – гэта саюз мужчыны і жанчыны.

У Літве з пачатку XXI ст., падобна Венгрыі, адбывалася чаргаванне ва ўладзе левацэнтрысцкай Сацыял-дэмакратычнай партыі Літвы (утворана ў 2001 г. у выніку аб’яднання Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі і Дэмакратычнай партыі працы. Правячая з 2001 г.) і правацэнтрысцкай Саюз

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Айчынны – Правыя кансерсватары. Яны на працягу першых двух дзесяцігоддзяў XXI ст. будуць чаргавацца ва ўладзе. За выключэннем 2016–2020 гг., калі ўрад ўзначальваў прадстаўнік партыі Саюз сялян і зялёных.

У Албаніі новай напружанасці ў палітычнае жыццё дабавілі парламенцкія выбары 2001 г. Перамогу атрымала СПА. Правацэнтрысцкая кааліцыя на чале з Дэмакратычнай партыяй не прызнала вынікі выбараў і байкатавала працу парламента да студзеня 2002 г. Выбары ў парламент 2005 г. прынеслі перамогу Дэмакратычнай партыі і яна замацавалася ва ўладзе да 2013 г. У 2009 г. Дэмакратычная партыя выступала на выбарах у складзе кааліцыі Саюз за перамены. С. Берыша па-ранейшаму займаў пасаду кіраўніка ўрада. Яго ўраду так і не ўдалося справіцца з адной з найбольш вострых праблем Албаніі – карупцыяй. У 2013 г. статус правячай вярнула Сацыялістычная партыя Албаніі, якая выступала вядучай сілай блока Альянс за еўрапейскую Албанію. Урад узначаліў яе лідар Эдра Рама. Такім чынам і ў Албанія ў 2010-я гг. адбылася палярызацыя палітычных сіл на левацэнтрысцкі і правацэнтрысцкі блокі, якія чаргуюцца ва ўладзе. Аднак у Албаніі гэтая фактычна двухпартыйная сістэма не стала ўстойлівай. Вясной 2019 г. краіна сутыкнулася з новым палітычным крызісам. Правацэнтрысцкая апазіцыя байкатавала работу парламента, пачаліся масавыя маніфестацыі. Падставай для выступлення сталі абвінавачванні правячых сацыялістаў у сувязях з наркамафіяй. Аднак сацыялісты змаглі захаваць кантроль над урадам і атрымалі перамогу на парламенцкіх выбарах 25 красавіка 2021 г.

Пасля дэмакратычных рэвалюцый для шэрагу постсацыялістычных краін важнае значэнне мела нацыянальнае пытанне. Для Албаніі – грэчаскае, для Румыніі – венгерская, для Венгрыі – румынскае, для прыбалтыйскіх краін – рускамоўнага насельніцтва. У Венгрыі, Румыніі былі заканадаўча замацаваны правы нацыянальных меншасцей на захаванне іх самабытнасці. Але ў румынскай канстытуцыі гаворыцца, што меры па абароне праў нацыянальных меншасцей не павінны прыводзіць да дыскрымінацыі іншых румынскіх грамадзян, замацавана перавага румынскай мовы. Венгерская канстытуцыя лічыцца найбольш дэмакратычнай у справе забеспячэння праў этнічных меншасцей. Яна аб'яўляе этнічныя меншасці складовымі часткамі дзяржавы і гарантуе ім магчымасць развіваць сваю культуру, карыстацца сваёй мовай, развіваць адукацыю на роднай мове.

**3.** Дэмакратычныя рэвалюцыі ў краінах ЦПУЕ выклікалі распад сацыялістычнага лагера, увасабленнем якога з'яўляліся Арганізацыя Варшаўскагна дагавора (АВД) і Савет эканамічнай узаемадапамогі (СЭУ). Летам 1991 г. абедзве гэтыя арганізацыі былі ліквідаваны.

Стратэгічным напрамкам знешняй палітыкі постсацыялістычных дзяржаў стала інтэграцыя ў заходнееўрапейскія і трансатлантычныя структуры, уступленне ў ЕС і НАТО. Спачатку адносна стрыманую палітыку ў гэтым напрамку праводзіла Румынія, бо ва ўладзе там да 1996 г. знаходзіліся левыя сілы, звязаныя з камуністычным мінулым краіны. У 1996 г. буйнейшыя палітычныя партыі Румыніі падпісалі пагадненне, якое

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

знаменавала сабой дасягненне нацыянальнага кансенсуса адносна ўступлення краіны ў ЕС.

Першапачаткова ЕС выбраў тактыку пашырэння супрацоўніцтва з новымі дэмакратычнымі краінамі ЦПУЕ  на аснове пагадненняў аб асацыяваным членстве. У 1991 г. такое пагадненне з ЕС падпісала Венгрыя. Затым аналагічныя пагадненні падпісалі іншыя постсацыялістычныя дзяржавы, уключаючы краіны Балтыі. Пагадненне аб асацыяваным членстве мела на ўвазе пастаянныя палітычныя кансультацыі і шырокае эканамічнае супрацоўніцтва з ЕС, уключаючы рэжым свабоднага гандлю. У перспектыве – уступленне ў ЕС. Тэрміны ўступлення ў ЕС былі пастаўлены ў залежнасць ад ўзроўня эканамічнага і палітычнага развіцця краін-прэтэндэнтаў. Амстэрдамскі дагавор 1997 г. замацаваў курс на паслядоўную інтэграцыю былых сацыялістычных краін у ЕС.

Рэальны працэс уступлення былых сацыялістычных краін у ЕС пачаўся ў 2004 г. Яго членамі, сярод іншых, сталі Літва, Латвія, Эстонія, Венгрыя. У 2009 г. да ЕС далучылася Румынія. Сярод постсацыялістычных неславянскіх краін за межамі ЕС застаецца Албанія. Яна мае стутс кандыдата на ўступленне ў ЕС.

Канцэпцыя пашырэння сувязей НАТО з былымі краінамі – членамі АВД была адобрана яшчэ ў 1990 г. на Лонданскай канферэнцыі міністраў замежных спраў альянса. 9 снежня 1991 г. краіны НАТО разам з 9 былымі сацыялістычнымі краінамі стварылі Савет паўночнаатлантычнага супрацоўніцтва – шматбаковы кансультацыйны орган. А з 1994 г. пачало ажыццяўляцца супрацоўніцтва паміж НАТО і былымі сацыялістычнымі краінамі ў рамках праграмы “Партнёрства дзеля міру”. Яна намячала правядзенне сумесных манёўраў, гуманітарных акцый, выратавальных аперацый, уніфікацыю ўзброеных сіл. У 1996–1997 гг. пачаліся перамовы з краінамі ЦПУЕ аб уступленні ў Паўночна-Атлантычны Альянс. Сярод іх былі Албанія, Венгрыя, Румынія, Латвія, Літва, Эстонія. На Мадрыдскім саміце НАТО афіцыйнае запрашэнне ўступіць у альянс было накіравана Венгрыі, Польшчы і Чэхіі. У 1999 г. яны сталі першымі членамі НАТО з ліку былых сацыялістычных краін. У 2004 г адбылося новае пашырэнне НАТО за кошт былых сацыялістычных краін. Членамі блока сталі Румынія, Славенія, Балгарыя, Славакія, Эстонія, Латвія, Літва. Апошняя сярод неславянскіх краін ЦПУЕ, якая ўвайшла ў НАТО, – Албанія (2009 г.).

Рухаючыся ў бок уступлення ў НАТО, былыя сацыялістычныя краіны актыўна падтрымлівалі палітыку блока. Так, Румынія ў 1999 г. прадаставіла сваю тэрыторыю і паветраную прастору для выкарыстання НАТО ў час аперацыі супраць Югаславіі, у 2002 г. накіравала свой вайсковы кантынгент у Афганістан, у 2003 г. падтрымала ўварванне ЗША і іх саюзнікаў у Ірак. Фактычны адзіны прыклад нязгоды Румыніі з палітыкай калектыўнага Захаду – адмова прызнаць незалежнасць Косава. З 2013 г. на тэрыторыі Румыніі пачаліся работы па стварэнню амерыканскай базы ў рамках сістэмы ПРО ў Еўропе.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Краіны ЦПУЕ ў новых умовах спрабавалі падтрымліваць інтэграцыйныя працэсы і паміж сабой. Прыкладам можа служыць стварэнне Вышаградскай групы ў складзе Польшчы, Чэхіі, Славакіі і Венгрыі. Літва, Латвія і Эстонія яшчэ ў 1990 г. стварылі Савет балтыйскіх дзяржаў. Асаблівасць Албаніі заключаецца ў тым, што гэта ісламская краіна. Таму яна ў 1992 г. падпісала дагавор аб далучэнні да Арганізацыі ісламскага супрацоўніцтва.

Спецыфіка знешнепалітычнай сітуацыі для Літвы, Латвіі і Эстоніі заключалася ў тым, што для іх важнейшай задачай знешняй палітыкі стала дасягненне міжнароднага прызнання. Яе вырашэнне знайшло падтрымку вядучых дзяржаў свету, якія лічылі новыя рэспублікі працягам дзяржаўнасці Літвы, Латвіі і Эстоніі міжваеннага часу. Ужо ў верасні 1991 г. тры балтыйскія дзяржавы былі прыняты ў ААН.

Адносіны краін ЦПУЕ з Расіяй адразу пасля дэмакратычных рэвалюцый вызначаліся перш за ўсё жаданнем новых эліт вызваліцца з-пад уплыву Масквы. Палітычныя кантакты, таварзварот аказаліся на самым нізкім узроўні. Толькі з канца 1990-х гг. пачынаецца аднаўленне на новай аснове адносін паміж посткамуністычнай Расіяй і краінамі ЦПУЕ. Адносіны паміж Расіяй і новымі дэмакратыямі ЦПУЕ знаходзяцца яшчэ пад уплывам стэрэатыпаў і крыўд мінулых часоў. Напрыклад адносіны Расіі з краінамі Балтыі. Тут гістарычная памяць, звязаная з анексіяй гэтых дзяржаў СССР у 1940 г., пытанне аб становішчы рускамоўнага насельніцтва накладаюць адмоўны адбітак на адносіны Латвіі, Літвы і Эстоніі з Расіяй. Ускладняюцца адносіны паміж Расіяй і краінамі ЦПУЕ ў сувязі з розным стаўленнем да працэсаў, якія адбываюцца на постсавецкай прасторы. Негатыўную рэакцыю Расіі выклікала ўступленне былых сацыялістычных краін у НАТО.

З 2010-х гг. з постсацыялістычных неславянскіх краін у Расіі больш паспяхова развіваліся адносіны з Венгрыяй. Кабінет В. Орбана праводзіў палітыку на супрацоўніцтва з Расіяй, перш за ўсё ў эканамічнай сферы. У. Пуцін характарызаваў Венгрыю як прыярытэтнага партнёра Расіі ў Цэнтральнай Еўропе. Венгрыя прыняла актыўны ўдзел у рэалізацыі праекта "Паўднёвы паток". Расія мадэрнізавала Венгерскую АЭС.

Албанія аказалася ўцягнутай у этнічны канфлікт у Косава. У канстытуцыі краіны 1998 г. было заяўлена, што Рэспубліка Албанія абараняе правы албанскага народа, які пражывае за яе межамі. Абапіраючыся на гэтае палажэнне канстытуцыі, Албанія актыўна падтрымлівала албанцаў у Косава. Яе тэрыторыя стала базай для дзеяння Арміі вызвалення Косава. С. Берыша заявіў, што Дэмакратычная партыя не спыніць барацьбу да таго часу, пакуль яе вялікая мара аб аб'яднанні албанскай нацыі не стане рэальнасцю. У сярэдзіне 2000-х гг. у Албаніі быў дасягнуты нацыянальны кансенсус адносна косаўскай праблемы. Адвяргалася ідэя перамоў пры міжнародным пасрэдніцтве і ставілася задача дасягнуць незалежнасці Косава. Калі 17 лютага 2008 г. Косава абвясціла сваю незалежнасць, Албанія адразу яе прызнала і імкнулася садзейнічаць міжнароднаму прызнанню Косава. Як паказала апытанне грамадзян Косава і Албаніі, абсалютная большасць з іх (адпаведна 74,2 %, 70,5 %) выступаюць за аб'яднанне дзвюх краін і стварэнне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вялікай Албаніі. Косаўская праблема прывяла да замарожвання адносін Албаніі з Сербіяй. Згодна сербскай канстытуцыі Косава з'яўляецца часткай Сербіі. Падтрымка Албаніяй сепаратысцкага руху албанцаў ў Паўночнай Македоніі ўскладняе адносіны і з гэтай краінай. У 2001 г. мясцовыя албанцы паспрабавалі ўзняць мяцеж, але гэтая спроба была ліквідавана з дапамогай міжнароднага ўмяшання.

Для Румыніі асаблівае месца займаюць адносіны з Малдовай. Прэзідэнт Бэсеску неаднаразова рабіў заявы, што Малдова з'яўляецца часткаю гістарычнай Румыніі і дзве дзяржавы рана ці позна ўз'ядналюцца. Але на практыцы рэалізоўваецца канцэпцыя інавання дзвюх румынскіх дзяржаў. Прыярытэтам сваёй знешняй палітыкі Румынія абвясціла басейн Чорнага мора і імкнецца наладжваць супрацоўніцтва з краінамі рэгіёна. Аднак тут яна сустрэсла супрацьдзеянне Расіі. Адмоўна на румынска-расійскія адносіны ўплываць пытанні Прыднястроўя, а апошнім часам – удзел Румыніі ў еўрапейскай ПРО.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ